# Музей установы адукацыі як цэнтр вывучэння роднага краю і захавання вобраза «малой Радзімы» ў свядомасці маладога пакалення

(з вопыту работы Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея ў Год гістарычнай памяці)

Альшэўская Галіна Антонаўна,
дзяржаўная ўстанова адукацыі «Бердаўская базавая школа Лідскага раёна»,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
кіраўнік Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея

У Беларусі, акрамя буйных гарадоў з багатай гісторыяй і сучасным дынамічным развіццём, ёсць і невялікія населеныя пункты, якія перажылі віхуры розных эпох. Да такіх у Лідскім раёне адносіцца вёска Бердаўка, што ўжо 15 год носіць статус аграгарадка. Гісторыю ж яе ад першага пісьмовага ўпамінання ў 1527 годзе па сённяшні дзень ужо амаль 35 год збіраюць і вывучаюць у Бердаўскім гісторыка-краязнаўчым народным музеі.

Адметнай асаблівасцю нашага музея з’яўляецца дзейнасць у рамках музейнай педагогікі, асноўная мэта якой – стварэнне ўмоў для развіцця асобы шляхам уключэння яе ў такую разнастайную і шматбаковую дзейнасць.

Мяркую, тут дарэчы сказаць некалькі слоў аб гісторыі стварэння нашага музея.

Другая палова 80-х гадоў XX стагоддзя адзначылася ў грамадстве рэзкай зменай каштоўнасных арыенціраў і прыярытэтаў. Разам з палітычным ладам змяталіся і агульнаэтычныя і эстэтычныя ўяўленні. Услед за камуністычнымі догмамі сыходзілі паняцці радзімы, гераізму, патрыятызму, пакідалі лідзіруючыя пазіцыі дзіцячыя арганізацыі акцябрат, піянераў, камсамол…

Педагогі, выхавацелі, разумеючы, што неабходна фарміраваць грамадзянскую пазіцыю ў падрастаючага пакалення, бо гэта – будучыня дзяржавы, шукалі новыя формы работы з вучнямі і дашкольнікамі. Менавіта тады ўзнікла ідэя стварэння ў школе гісторыка-краязнаўчага музея. У яго аснову была пакладзена гісторыя вёскі, раней дасканала амаль нікім не вывучаная.

На працягу існавання нашага музея яго актывам праводзілася карпатлівая работа па вывучэнні мясцовага матэрыялу – эканамічнай, сацыяльна-палітычнай, культурнай і духоўнай гісторыі развіцця вёскі і раёна. Музейны фонд папаўняўся старадаўнімі рэчамі, дакументамі, кнігамі, фотаздымкамі. Запісваліся абрады, песні, легенды і паданні мясцовасці, успаміны ветэранаў вайны і працы. Здзяйсняліся этнаграфічныя вандроўкі і паходы па населеных пунктах Лідскага і Іўеўскага раёнаў, археалагічныя раскопкі з удзелам навукоўцаў. Вялася пошукавая і даследчая работа, арганізоўвалася перапіска з архівамі, музеямі, людзьмі, чый лёс звязаны з нашай мясцовасцю. За гады дзейнасці музея школьнымі краязнаўцамі напісаны каля чатырох дзясяткаў краязнаўчых артыкулаў, якія размяшчаліся на старонках мясцовых, рэспубліканскіх і замежных СМІ. Выдадзена кніга “Пакінуць след на зямлі” (аўтар А. Л. Крупа) і некалькі тэматычных брашур.

Такім чынам, з цягам часу музей набыў не толькі афіцыйны статус народнага (2005 год), але і негалосны статус цэнтра вывучэння роднага краю і

захавання ў свядомасці падрастаючага пакалення вобраза «малой Радзімы». З дапамогай музея, дзейнасць якога арганізавана па розных напрамках (вучэбна-даследчая і праектная; гісторыка-краязнаўчая; экскурсійна-асветніцкая; пошукава-збіральніцкая; калектыўна-творчая), асяроддзе ўстановы адукацыі і сацыякультурнае асяроддзе выступаюць як адзіная сістэма ў грамадзянскім і патрыятычным выхаванні вучняў.

Адукацыйныя праекты музея сёння – гэта, перш за ўсё, кансалідацыя намаганняў вучняў і педагогаў, законных прадстаўнікоў і сацыяльных партнёраў. У прыватнасці, у Год гістарычнай памяці – у захаванні калектыўнай памяці народа аб людзях і падзеях Вялікай Айчыннай вайны, аб значных постацях і істотных фактах гісторыі «малой Радзімы».

Цікавым вопытам стаў рэалізаваны ў лютым-маі 2022 года сацыяльны праект патрыятычнай накіраванасці «Памяць роднай зямлі». Гэты праект прадставіў унікальную магчымасць вучням не толькі нашай ўстановы адукацыі далучыцца да агульнай справы па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі нацыянальна-культурнай спадчыны лідскай зямлі, развіцці цікавасці да беларускай гісторыі і культуры ўвогуле. Асноўнымі мэтамі праекта былі вызначаны зварот увагі яго ўдзельнікаў на актуальную сацыяльную праблему гістарычнага бяспамяцтва ў сучасным грамадстве і прыцягненне да практычнай дзейнасці, накіраванай на яе вырашэнне ўласнымі сіламі; выхаванне ў вучняў пачуцця грамадзянскасці і патрыятызму, гонару за прыналежнасць да сваёй нацыі, гонару за сваю Радзіму на прыкладзе жыцця і подзвігу герояў і знакамітых людзей, у тым ліку землякоў; фарміраванне навыкаў правільных паводзін у грамадстве, пашырэнне кругагляду вучняў, садзеянне павышэнню іх культурнага ўзроўню і развіццё здольнасці да творчасці. У працэсе каманднага ўзаемадзеяння вырашаны задачы праекта. Праз паглыбленне ведаў пра трагічнае і гераічнае мінулае роднага краю удзельнікі, вывучаючы гісторыю стварэння мемарыяльных знакаў лідскай зямлі, далучыліся да гісторыі і культуры свайго народа. Ва ўстановах адукацыі каманд-удзельніц актывізавана даследчая гісторыка-краязнаўчая і экскурсійна-турыстычная дзейнасць. Пашыраны тэарэтычныя веды ўдзельнікаў пра віды мемарыяльных знакаў (помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных дошак і інш.) як сродкаў захавання гістарычнай і культурнай памяці беларускага народа. Узбагацілася інфармацыйнае напаўненне музейных сайтаў (старонак) чатырох устаноў адукацыі раёна. Праз камандныя акцыі #памяцьудзеянні, накіраваныя на ўборку і добраўпарадкаванне мемарыяльных знакаў гісторыі і культуры, здзейснены практычны ўклад у справу захавання гэтых знакаў. Акрамя таго, у ходзе рэалізацыі этапаў праекта разнастаіліся шляхі папаўнення ведаў вучняў, формы іх захавання і папулярызацыі, набыты неабходны ў сучасным свеце досвед узаемадзеяння ў камандзе. Праектныя мерапрыемствы, сярод якіх даследчая размінка «Калейдаскоп мемарыяльных знакаў» і віртуальнае падарожжа «Люблю і ведаю свой край», развівалі ва ўсіх удзельнікаў праекта карысныя навыкі і ўменні, накіраваныя на самадысцыпліну і планаванне ўласнай дзейнасці, правядзенне аналізу атрыманай інфармацыі, фарміраванне высноў аб праведзенай рабоце. Анлайн-конкурс «Імя на камені», творчы праект

«Маршрутамі Лідчыны», завочны конкурс аўдыёгідаў «Памяць і слава роднага краю» дазволілі ўдасканаліць творчыя ўменні і навыкі вучняў, у тым ліку выкарыстання ІКТ. Больш падрабязна з матэрыяламі, якія ілюструюць працэс рэалізацыі названага праекта, можна пазнаёміцца ў прэзентацыі (https://docs.google.com/presentation/d/1mgLdK61VIpWu-hWotqhei0_Ab10_ZDim/edit?usp=sharing&ouid=100519948082109540506&rtpof=true&sd=true).

Штогод вучні і педагогі абіраюць для сваіх краязнаўчых даследаванняў актуальныя тэмы. У апошнія гады ў асаблівым фокусе аказалася тэма генацыду беларускага народа. І ў Год гістарычнай памяці для нас выключна важным стала, каб кожны зразумеў, што такое генацыд і як у гады Вялікай Айчыннай вайны гэтая з'ява адлюстроўвалася ў «негераічных», на першы погляд, лёсах мірных беларусаў. Таму ў межах названай тэмы намі праведзена даследаванне «Лёс "маленькага чалавека" ў вялікай трагедыі беларускага народа». Гэта дазволіла папоўніць музейны фонд матэрыяламі пра лёс жыхаркі горада Ліды, былога непаўналетняга остарбайтара Лідзіі Іванаўны Лях (Руткоўскай) (https://docs.google.com/document/d/1qKPyv6-Z0ixNqgeOE5fee6TNTQjSoOZ-/edit?usp=sharing&ouid=100519948082109540506&rtpof=true&sd=true).

Традыцыі пошукавай работы, звязанай з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, закладзены ў нашай установе адукацыі яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Нашы папярэднікі сабралі падрабязныя звесткі пра аднавяскоўцаў, якія прайшлі ваеннымі дарогамі суровых саракавых гадоў. У музейным фондзе афармлены матэрыялы пра воінаў і партызанаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні лідскай зямлі ад фашысцкіх захопнікаў і пахаваныя ў брацкай магіле ў парку вёскі Бердаўкі. Таму, здавалася б, што новага можна арганізаваць у дадзеным накірунку ў рабоце патрыятычна-краязнаўчага клуба "Пошук"? Тым не менш, такая работа набывае свае акцэнты. Напрыклад, напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і Дня вызвалення горада Ліды ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Бердаўцы адбылася цікавая падзея. Яна стала працягам пошукавай работы сярэдзіны 80-х гадоў і вынікам работы сённяшніх школьных краязнаўцаў, а таксама сведчаннем таго, як на бердаўскай зямлі захоўваецца памяць пра воінаў-вызваліцеляў і падзеі той страшнай вайны. 1 ліпеня ў Бердаўку, каб пакланіцца ў мясцовым парку месцу пахавання гвардыі сяржанта Голубева Канстанціна Сяргеевіча, прыехалі яго сваякі з ніжагародскай вобласці [1]. І гэтая сустрэча яшчэ раз пацвердзіла, што памяць людская – наймацнейшая зброя ў вайне з невуцтвам і фальсіфікацыяй гісторыі. Дзякуючы такім падзеям бердаўскія вучні прымаюць для сябе важнае ўсведамленне: будзе ў нашых сем'ях беражліва захоўвацца памяць пра Вялікую Айчынную вайну – будуць у нашчадкаў ключы да гістарычнай праўды.

Калі мы гаворым пра захаванне вобраза «малой Радзімы» ў свядомасці прадстаўнікоў маладога пакалення, трэба помніць, што малая Радзіма – гэта не проста месца на карце, дзе ты вырас і дзе цябе чакаюць, гэта не толькі адчуванне дома, цеплыні і любві. Важна ўсведамляць, што гэта і людзі, якія пакінулі ў гісторыі родных мясцін свой след – справы рук, помыслаў і ўчынкаў. Менавіта з улікам дадзенага меркавання ў бягучым годзе ў нашым музеі адкрылася выстава «Адданыя роднай зямлі» [2], лагічна ўключаная ў

цэнтральную частку музейнай залы «Агеньчык яе будзе гарэць вечна…» (гісторыя адукацыі ў Бердаўцы). Новая выстава прысвечана сям’і бердаўскіх педагогаў, заўзятых краязнаўцаў – былога дырэктара школы, настаўніка гісторыі і грамадазнаўства, заснавальніка Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея Крупы Анатоля Леанідавіча і настаўніка рускай мовы і літаратуры Крупы Наталлі Фёдараўны. Сабраныя тут інфармацыя, фотаматэрыялы, дакументы, узнагародныя лісты і ўласныя рэчы дазваляюць пазнаёміцца з працоўнай біяграфіяй і фактамі асабістага жыцця людзей, цалкам прасякнутых любоўю да педагогікі і аддадзеных ёй. І ў Лідскім раёне ўжо ініцыявана прапанова рэкамендаваць дадзеную экспазіцыю для абавязковага наведвання педагагічнымі калектывамі ўстаноў адукацыі, маладымі спецыялістамі і вучнямі педагагічных класаў. На яскравым прыкладзе лёсу годных землякоў яны змогуць упэўніцца ў важнасці і адказнасці абранай прафесіі. Усім наведвальнікам, і ў першую чаргу мясцовым вучням, такая выстава дазваляе натуральна, без маралізатарства пераняць ад старэйшага пакалення бясцэнны вопыт і жыццёвую мудрасць.

Такім чынам, музейныя праекты Года гістарычнай памяці паказваюць, якую практычную карысць прыносяць падобныя мерапрыемствы ў плане лепшага разумення гістарычнага мінулага свайго краю і ўсёй краіны, усведамлення ролі чалавечага фактару ў айчыннай гісторыі, фарміравання канкрэтных ведаў пра родны край і яго людзей, пашырэння кругагляду маладога пакалення ва ўмовах музейнага асяроддзя. Вучні актыўна перажываюць пачуццё ўласнай датычнасці і дзейнага ўдзелу ў справе, а музей як храм Мінулага і адлюстраванне Сучаснасці ператвараецца ў трывалы мост у Будучыню. Значыць, вывучэнне роднага краю і захаванне вобраза «малой Радзімы» ў свядомасці прадстаўнікоў маладога пакалення праз музейную дзейнасць – эфектыўны сродак іх грамадзянскага і патрыятычнага выхавання.

**Крыніцы інфармацыі**


1. Альшэўская, Г. А. Шлях на 1350 кіламетраў і 16 гадзін за рулём. Яўген Голубеў разам са сваёй сям’ёй прыехаў з Расіі, каб пакланіцца магіле дзеда / Г. А. Альшэўская. – Тэкст электронны // Лідская газета. – 2022. – 14 ліпеня. – Рэжым доступу: http://lidanews.by/news/life/26291news.html. – Дата доступу: 13.09.2022.
2. Капцэвіч, В. У Бердаўскім гісторыка-краязнаўчым народным музеі падзея: адкрыта экспазіцыя памяці Анатоля Крупы / В. Капцэвіч. – Тэкст электронны // Лідская газета. – 2022. – 23 чэрвеня. – Рэжым доступу: http://lidanews.by/news/life/26103news.html?sphrase_id=40693. – Дата доступу: 13.09.2022.